***К. Г. Навуменка***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## РЭАЛЬНЫ І ФАНТАСТЫЧНЫ ПАЧАТКІ Ў РАМАНЕ «АВАНТУРЫ ПРАНЦІША ВЫРВІЧА, ШКАЛЯРА І ШПЕГА» Л. РУБЛЕЎСКАЙ

«Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» Л. Рублеўскай – першы раман пенталогіі аб прыгодах маладога шляхціца ў XVIII стагоддзі. Жанр твора ідэнтыфікуецца самой аўтаркай як прыгодніцка-фантасмагарычны раман. Сапраўды, акрамя прыгод Пранціша, якія сустракаюцца на шляху героя, дакладных гістарычных звестак, тут прысутнічаюць і элементы містыкі і фантастыкі. Фантасмагорыя – гэта мудрагелісты збег абставінаў, ператварэнні, падзеі, якія могуць быць успрынятыя як рэальнасць і такім чынам ствараюць ужо не проста міфічны віртуальны свет, а цалкам рэальную карціну жыцця. Нярэдка фантасмагарычная дзея развіваецца па законах сну і ўспрымаецца як міраж, галюцынацыя, трызненне. У творы яна праступае менавіта праз сны героя, якія ўяўляюць з сябе незвычайныя выявы, што характарызуюць яго эмацыйны стан. Так, Пранцысь быў настолькі ўражаны паннай Багінскай, што сніць яе. Але нечакана дзяўчына рассыпаецца пярлінамі, што моцна пужае маладога шляхціца.

У творы элементы містычнага выглядаюць такімі ў ракурсе погляду аднаго з герояў. У час навучання ў калегіуме Пранціш заступіўся за Дзянісія і пазней пасябраваў з хлопцам, якога звалі Варанём. Дзянісія вельмі не любіў іх настаўнік лаціны пан Баніфацый. Калі студэнты запусцілі ў клас варону і віну скінулі на Дзянісія, настаўнік раззлаваўся і пасадзіў яго ў карцэр. Хлопец моцна застудзіўся і згарэў, як свечка, за тры дні. Каб адпомсціць за сябра, Пранцысь налавіў варон і падкінуў у пакой настаўніка, які моцна напалохаўся, сутыкнуўшыся ў цемры са страшным і невытлумачальным.

Аднак у параўнанні з прызнанымі фантастычнымі жанрамі «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» выглядаюць досыць рэалістычна. Другасная мастацкая ўмоўнасць выкарыстоўваецца тут як асобны прыём, ствараючы толькі адпаведны фон дзеяння. Ды і нават сам Пранцысь не звяртае ўвагі на гэтыя з'явы. «Жанр твора дае аўтару права на канфліктныя супрацьстаянні розных груповак шляхты, іх фанабэрыстасць перад іншымі грамадзянамі краіны падаваць, не адступаючы ад гістарычнай праўды, у камічным, іранічным асвятленні» [1], – падкрэслівае, і даволі слушна, рэалістычную аснову твора Т. Кабржыцкая. Галоўны герой рамана Пранціш Вырвіч герба Гіпацэнтаўр – збяднелы шляхціц, які, нягледзячы на ўмовы і жыццёвыя абставіны, не згубіў свайго гонару. Вобраз героя, як і належыць раманнай форме, падаецца ў пастаянным руху, развіцці – ад ганарыстага хлапчука без адукацыі да смелага і самаахвярнага мужчыны. У канцы рамана Вырвіч становіцца сапраўдным шляхціцам, які паважае не толькі сваіх продкаў, але і іншых людзей, не прыніжае нават слабейшых.

Такім чынам, галоўнай задумай рамана «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» Л. Рублеўскай быў паказ эпохі XVIII стагоддзя, яе нораваў і праблем, а таксама праз вобраз галоўнага героя – сцвярджэнне духоўнага багацця беларусаў. У пісьменніцы добра атрымалася злучыць містычнае, фантастычнае і гістарычны факт для вырашэння сур'ёзных нацыянальных і філасофскіх праблем.

### Літаратура

1 Зорка жаночага рода! / Т. В. Кабржыцкая [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://pdf.kamunikat.org/25497-1.pdf. – Дата доступу : 21.04.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ